ПАМЯЦЬ

Алесь Карлюкевіч

# ДЭПУТАЦКІЯ КЛОПАТЫ УЛАДЗІМІРА ЛАБАНКА



Бываючы на Пухавіччыне, стараюся зазірнуць у Дукору. Старажытнае, багатае на гісторыю паселішча. Багатае і на слынных ураджэнцаў. Адсюль родам — першы старшыня ЦВК БССР, першы старшыня Саўнаркама БССР Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў (1892—1937). Мястэчка Дукора — радзіма трох братоў — яўрэйскіх пісьменнікаў Чарны: Барух Нахман Чарны (1886—1938) — літаратуразнавец, празаік, публіцыст, рэдактар; Шмуэль Нігер (1883—1955) — літаратурны крытык, празаік і публіцыст; Даніэль Чарны (1888—1959) — паэт, празаік, мемуарыст, публіцыст, перакладчык. Дукора — радзіма мастакоў, акцёраў, вучоных, вайскоўцаў, палітычных і грамадскіх дзеячаў... І тут надзвычай багатая на асветніцкую гісторыю школа. У Дукорскай школе выкладаў заслужаны настаўнік БССР, адзін з пачынальнікаў беларускай савецкай драматургіі Васіль Савіч Гарбацэвіч (1893—1985). Пасля вызвалення Дукоры ад фашысцкай навалы дырэктарам быў прызначаны Павел Мікітавіч Шычко, якому ў 1947 годзе было прысвоена званне заслужанага настаўніка БССР. Сярод вучняў — паэт, празаік, публіцыст Аляксандр Хазянін (нарадзіўся ў 1948 годзе), паэт Алесь Пісарык (нарадзіўся ў 1954 годзе), арганізатар і кіраўнік дукорскага партызанскага атрада ў час савецка-польскай вайны Андрэй Блажко (1895—1920), актрыса Таццяна Бандарчык (1902—1974), мовазнаўца, доктар філалагічных навук Марыя Жыдовіч (1906—1977)...

У 1926 годзе школу ў Дукоры скончыў Уладзімір Лабанок (тады навучальная ўстанова называлася наступным чынам — Дукорская сямігадовая школа з сельскагаспадарчым ухілам). Вядомасць гэтага чалавека занатавана ў назвах вуліц. Адна з іх — вуліца Уладзіміра Лабанка ў мінскім мікрараёне Сухарава.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы*